**Н.А.Міцкевіч,**
*суіскальнік кафедры рэжысуры свят*

# КАРНАВАЛІЗАЦЫЯ Ў НАРОДНЫХ СВЯТАХ БЕЛАРУСІ

Мастацкія формы культуры, калі пранікаюць у сферу свята, ачышчаюць яго ад несвяточнага, будзённага. Святочная культура захоўвае, развівае і адкрывае вышэйшыя каштоўнасці чалавечага быцця, усяго таго, што мае адносіны да свабоды: святочных выразна гульнявых зносін, святочных паводзін, святочнага светаадчування. А гэта абавязкова суправаджаецца радасцю, смехам, весялосцю.

На сучасным этапе універсальнай канцэпцыяй свята ў параўнанні з "працоўнай" тэорыяй В.Пропа з'яўляецца тэорыя М.Бахціна, якую ён выказаў у кнізе "Творчасць Франсуа Рабле і народная культура сярэдневякоўя і Рэнесансу". Згодна гэтай тэорыі, свята не толькі дубліруе працу, падводзячы вынікі працоўнага цыкла, але і абвяшчае народны ідэал жыцця, з якім яно звязана. Дадзенай канцэпцыі М.Бахціна нельга адмовіць ні ў матэрыялістычнасці, ні ў гістарычнасці, ні ў сацыяльнасці, і ў параўнанні з "працоўнай" тэорыяй яна глыбей раскрывае змест свята як сацыяльна-мастацкай з'явы. Свята, паводле Бахціна, не проста мастацкае ўзнаўленне ці адлюстраванне жыцця. Гэта само жыццё, якое аформлена гульнявым спосабам і, значыць, звязана з чалавечай культурай, але прадстаўляе і ўвасабляе яго своеасабліва. Канцэпцыя Бахціна не адмаўляе сувязей свята ні з працоўнай дзейнасцю, ні з мастацтвам; яна накіроўвае ўвагу на асаблівую сацыяльна-мастацкую сферу святочнасці, якая знаходзіцца на мяжы ўмоўнага мастацтва і рэчаіснасці. Гэтая канцэпцыя дае канкрэтна-гістарычнае тлумачэнне карнавалу. Карнавал, паводле Бахціна, гэта "другое жыццё народа", дзе сітуацыя зняцця забароны, часовага выхаду за межы звычайнага ладу



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыцця ўяўляе выдатны ідэальна-рэальны тып зносін паміж людзьмі, які разглядаецца як вельмі значны, але часовы момант. Карнавал — гэта перамога смеху "неафіцыйнай народнай праўды" над "афіцыйнай". Канцэпцыя Бахціна сёння з'яўляецца выверaным навуковым суджэннем.

Формы і значнасць свят далёка не аднолькавыя ў розных культурах і рэлігіях. Акрамя таго, на іх аказваюць уплыў такія фактары, як мода і ўзровень развіцця тэхнікі; аднак незалежна ад маштабаў свята заўсёды звязана з трансцэндэнтнай творчай сілай.

Карнавал "выходзіць" далёка за рамкі тэатралізацыі, ён дапамагае яднанню ўдзельнікаў аднаго з адным, адлюстроўвае агульнае ўспрыманне быцця, прагнае жаданне жыцця. Гэта паняцце метафізікі ў дзеянні. Традыцыйныя формы карнавалу не з'яўляюцца знешнім пасіўным атрыбутам дзеяння, а ўвасабляюць яго сутнасць, своеасаблівы экзістэнцыяльны акт, спробу ўмяшацца ў законы быцця.

Карнавал — гэта цэнтр жыццядзейнасці, ён эстэтычна арганізуе час чалавека. Сувымераючы яго з рытмам прыроды (космасу), карнавал уносіць у жыццё элементы цэласнасці, гармоніі і прыгажосці. Асновай гэтай цэласнасці і гармоніі з'яўляецца гратэск — асноўны прыём пры стварэнні карнавальнага мастацтва.

Сярод свят зімовага цыкла калядны карнавал (Каляды) найбольш ярка ўяўляе гратэскавую вобразнасць. У беларусаў назва "каляды" замацавалася за перыядам з 24 снежня па 6 студзеня. Абрад калядавання, звычай пераапранання на беларускай зямлі маюць мноства варыянтаў. Цэнтральная маска навагодняга пераапранання — "каза" ці "казёл". Яна была распаўсюджана не толькі ў Беларусі, але і на Украіне, у Расіі, Малдове, Чэхіі, Славакіі, Балгарыі. Звычайна каза прыбіралася наступным чынам: кажух, вывернуты аўчынай наверх, адзявалі адным рукавом на канец дугі, якая ўстанаўлівалася выпукласцю ўніз. Рукаў завязвалі, ён служыў шыяй і галавой, да якой



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прымацоўваліся рогі, зробленыя з саломы ці асакі. Да другога канца дугі прывязвалі хвост, таксама з саломы. Невысокага росту, спрытны ў танцах хлопец залазіў пад кажух і выконваў ролю казы.

Маску дзеда, якая мела таксама вялікую значнсць, рабілі наступным чынам: хлопца ці мужыка высокага росту апраналі ў старое адзенне, на спіне рабілі горб, прымацоўвалі бараду з ільну, у рукі давалі вялікі посах. У свіце, якая суправаджала "казу", была таксама і "маладзіца". Шчуплага хлопца апраналі ў жаночае адзенне: кашулю з вышытымі рукавамі, андарак, на шыю вешалі ўпрыгожанні, на галаву завязвалі хустку і падмазвалі сажай бровы.

У тым выглядзе, у якім абрад ваджэння казы дайшоў да нас, ён з'яўляецца не столькі абрадавым дзеяннем, колькі бытавой гульнёй, забавай. Аб гэтым сведчаць святочныя маскі, якія прысутнічаюць у калядным карнавале; афіцэр, пані (барыня), гандляр, цыган, яўрэй; маскі розных жывёл. Уся гэта маскарадна-гульнявая забава мела жартоўна-вясёлы карнавальны настрой.

Лялька — адзін з вядучых вобразаў у карнавалізацыі народнага свята. Яна ўдзельніца "хаджэння са звяздой", таксама лялечных прадстаўленняў, якія называліся ў народзе батлейкай. "Хаджэнне са звяздой" пачыналася з вечара 25 снежня і працягвалася да Новага года. Батлейка ў сваім рэпертуары мела лялечныя прадстаўленні на біблейскія сюжэты. Яны суправаджаліся музыкай. Тэатр гэтага тыпу быў своеасаблівым "тэатрам аднаго акцёра", які стаяў побач з лялечнай скрыняй. Акцёр-імправізатар за ўсіх спяваў і гаварыў, а калі было неабходна, то і прытанцоўваў. Батлеечнік выконваў інтэрмедыі, улічваючы сацыяльны склад гледачоў. Ён рабіў купюры, пашыраў ці змяншаў колькасць сцэн, якія ўзмацнялі ці прыглушалі сацыяльныя ацэнкі. Сярод герояў батлейкі Мужык, які пад рознымі імёнамі (Матэй, Антон, Ванька) высмейваў сваіх спрадвечных ворагаў — Шляхціца, Лекара, Чорта і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інш. У ліку лялечных персанажаў трэба назваць і Важатага з мядзведзем, якога ў пачатку XX ст. клікалі "Смаргонскі вучыцель з вучнем".

Калядны карнавал мае адметныя рысы: па-першае, калядная карнавалізацыя ўключае нараджэнне маскі, звычай пераапранання, стварэнне лялькі; па-другое, элементы карнавалізацыі пачынаюцца са стварэння касцюма.

Усе гэтыя неабходныя ўмовы каляднага карнавалу былі адлюстраваны пры пастаноўцы свята "Каляды" ў горадзе Светлагорску 15 студзеня 1990 г. Галоўны рэжысёр карнавалу — П.А.Гуд, мастак — Г.Г.Сакалоў-Кубай, музычны кіраўнік — А.М.Аляхновіч.

Адкрывала калядны карнавал урачыстая кавалькада Шчодры і Музыкі (баян, скрыпка, бубен), якія ў акружэнні зазывал забаўлялі народ. Рытмічная музыка, спевы шчадровак садзейнічалі чыстасардэчнасці, непасрэднасці ў адносінах паміж людзьмі. Музыка ў карнавале была стымулам актывізацыі гледача і, акрамя таго, значылася лепшым "сябрам" удзельнікаў народнага свята.

Калядны карнавал — гэта чаргаванне разнастайнай статыкі і дынамікі. Асабліва насычана эмоцыямі прадстаўленне ражаных. Маскі Цыгана, Каня, Кабылы, Жорава, Зайца ўпрыгожвала калядная зорка — сімвал Каляд. Рытуальнае "ваджэнне казы" выконвалася сярод гледачоў.

Калядны карнавал у Светлагорску гратэскна выяўляў таямнічае і загадкавае, увасобленае ў прадстаўленні, выклікаў захапленне ва ўсіх прысутных. Калядныя карагоды ("Заінька", "Грушка" і інш.), танцы ("Мяцеліца", "Лявоніха", "Жабка", "Трасуха") змянялі адзін аднаго. Вельмі многіх прыцягвала варажба з пеўнем.

Не так даўно ў цэнтральным дзіцячым парку імя М.Горкага г. Мінска з вялікім поспехам прайшло свята вясны "Калі зіма з вясной сустракаюцца", адным з рэжысёраў якога была аўтар гэтага артыкула.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вясенні карнавал пачынаўся шэсцем валачобнікаў па праспекце Францыска Скарыны. Яны выконвалі рытуальныя песні, вадзілі карагоды, захоўваючы пры гэтым старадаўні культ раслін і паэзію зеляніны. У руцэ кожнага валачобніка — доўгія шасты з белымі птушкамі-жураўлямі.

На цэнтральнай плошчы парка карнавал, які нагадваў чараду белых жураўлёў, сустракала Зіма. Гэта была велізарная лялька, якая сімвалізавала холад і смерць. Пачыналася прадстаўленне "Гуканне вясны", дзе старажытнымі спевамі і карагодамі выклікалася наступленне вялікіх сонечных дзён. Кульмінацыйным момантам прадстаўлення быў старажытны рытуал "Пахаванне стралы", які сімвалізаваў ахову азімага жыта ад маланак. У рытуале прымалі ўдзел выканаўцы і гледачы.

Магічныя вертыкальныя і гарызантальныя мізансцэны, рытмічны рух "птушак", яркія фарбы стваралі тую карнавальную атмасферу, калі ўзнікае цэлы свет гукаў і фарбаў. Безумоўна, лялькі, выкарыстаныя ў вясеннім карнавале, — дзіўная рэч. Яны неслі ў сабе не толькі гратэскавую вобразнасць, але і перадавалі настрой чалавека. Вялікія вертыкальныя мастацкія кампазіцыі ў свяце неабходны для арганізацыі прасторы. Лялькі аб'ядноўваюць людзей, яны дапамагаюць гледачам арыентавацца ў прасторы, ствараючы цудоўную атмасферу. Светлае, яркае і стыхійнае знаходзіцца ў кантэксце з цяжкім і цёмным. І тут узнікае адна з самых галоўных таямніц актывізацыі сучаснага гледача ў карнавале — актывізацыя праз гратэск.

Вялікдзень, або Вялічка, — гэта значыць вялікі дзень, доўгі дзень. Славяне ў час язычніцтва і нават з прыняццем хрысціянства наладжвалі святкаванні ў гонар светланоснага Дажбога, які дае ўсяму жыццё і змагаецца з цемрай, са злосным пачаткам, з зімой, з яе ўсёзнішчальнымі марозамі, завірухамі, мяцеліцай. Вось і ўстанаўліваюцца веснавыя святкаванні ў гонар багоў— апекуноў земляробчай культуры. Вітаецца і святкуецца наступленне вялікіх сонечных дзён, ці вялікадней.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Святкаванне наладжвалася на гарах або іншых адкрытых месцах. І вялікія, і малыя скакалі цераз вогнішчы, а потым насілі па сялу чучала Мару, увасабленне зімы, цёмнага, злоснага пачатку, а ў заключэнне яго спальвалі ці тапілі.

У беларусаў на Вялікдзень, увечары, па дварах і хатах хадзілі групы валачобнікаў (ад слова “валачыцца”) і своеасаблівымі спевамі віншавалі гаспадароў. Звычай гэты адзначаны толькі ў Беларусі і ў суседніх з ёй рускіх абласцях, дзе жыве беларускае насельніцтва.

Групы валачобнікаў складаюцца са сталых мужчын, што сведчыць аб сур’ёзнай значнасці гэтага абраду. Н.М.Нікольскі пісаў, што ў вясеннім валачобным абрадзе калі-нікалі прымалі ўдзел сталыя жанчыны, але дзяўчаты — ніколі.

У гэтым валачобным абрадзе, як і ў калядным, было прадстаўленне з элементамі карнавалізацыі. Працэс падрыхтоўкі ішоў наступным чынам: загадзя складаліся групы, размяркоўваліся ролі, праходзілі рэпетыцыі-спеўкі. Кіраваў групай вопытны чалавек і вельмі добры спявак. Абавязкова быў музыка, які граў на скрыпцы. Скамароху малявалі твар, адзявалі ў палатняныя абрэзкі, давалі ў рукі скрыпку. Музыка не толькі граў, але і танцаваў, ён быў галоўнай дзеючай асобай у абрадзе. Выбіралі ці наймалі механошу, які насіў велізарны мех, размалёваны каляровымі фарбамі. Гурты валачобнікаў пад вокнамі кожнай хаты спявалі шмат розных песень. На тыя грошы, якія збіралі ў дварах, куплялі пачастункі.

П.В.Шэйн адзначаў, што ў “былы час” у Магілёўскай губерні і некаторых іншых мясцовасцях на Вялікдзень хадзілі і лялечнікі. Па сутнасці гэта тыя ж валачобнікі, але яны насілі з сабой шырокую доўгую скрыню, у дно якой былі ўбіты калкі, дзе круціліся абабітыя рознакаляровым сукном конікі. У час спеваў скрыня рухалася то ўзад, то ўперад, і таму фігуркі конікаў рухаліся.

Песні спявалі валачобныя: прыпевы былі аднолькавыя, а мяняліся толькі запевы, замест “ішлі

валачобнікі” спявалі “ішлі-прыйшлі лялечнікі, гуляючы, спяваючы”.

Такім чынам, абрадава-святочныя традыцыі з’яўляюцца непасрэдным адлюстраваннем народнага самабытнага мастацтва. Гэтае мастацтва і з’яўляецца асновай укаранення элементаў карнавалізацыі ў народных святах беларусаў.

**Мохсен Али Еслам Ба-Шугейра,**
*аспирант кафедры социологии и культуроведения*

# ТРАДИЦИОННАЯ ОБРЯДНОСТЬ АРАБОВ И ЕЕ ОСВЕЩЕНИЕ В СРЕДСТВАХ МАССОВОЙ ИНФОРМАЦИИ ГОСУДАРСТВ АРАВИЙСКОГО ПОЛУОСТРОВА

В последние десятилетия важнейшей темой газетных и журнальных публикаций, радио и телевизионных программ стало отстаивание значительности культурных достижений народов, которые, казалось бы, не входили в орбиту более сильных и универсальных культур. На Востоке “движение в современность” во многом совершается на основе образцов, отыскиваемых в настоящее время или в наследии прошлого. Нередко это движение происходит на основе отталкивания от более поздних, или казалось бы, современных элементов, ставших непригодными и пагубными для полноценного развития. На телевизионных экранах “современность” предстает не только в разнообразии и дифференцированности, но и в большой разнородности. Те негативные элементы, которые проявляются, естественно, порождают протест и противодействие со стороны традиционного общества.

Важной особенностью культурно-исторической, политической и правовой детерминации государств Аравийского полуострова является то, что прошлое у них многомерно и неоднозначно. Обращение к прошлому



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ